ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
12
КАСТРЫЧНІКА
№ 26(1619)

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА

пад назвай «Прымяненне калыхальных спектраў да даследавання неарганічных і каардынацыйных спалучэнняў» прайшла нядаўна ў БДУ імя У. І. Леніна. Яна сабрала вучоных, якія працуюць у гэтым напрамку, з 40 гарадоў краіны: Масквы, Мінска, Кіева, Ленінграда, Новасібірска, Кішынёва, Саратава і іншых. Кожны з удзельнікаў прачытаў даклад, у якім выказаў свой погляд на праблему, свае прапановы, вывады, прывёў вынікі даследаванняў. Усё гэта — плён шматгадовай напружанай працы ў галіне спектраскапіі.

Праграма нарады ўключала пленарныя, стэндавыя і секцыйныя даклады. Усяго працавала тры секцыі: калыхальныя спектры і пабудова неарганічных злучэнняў, калыхальныя спектры і пабудова каардынацыйных злучэнняў, калыхальныя спектры адсарбіраваных малекул. Але асноўная трыбуна, дзе кожны мог адабраць ці абвяргаць, падтрымліваць ці не згаджацца,— гэта дыскусіі.

З. МІХНЕВІЧ.

ВЫ ЦІКАВІЦЕСЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ?

Калі так, то, безумоўна, хочаце навучыцца прыгожа гаварыць, правільна пісаць. У гэтым вам дапамогуць кнігі. Прапануем наступныя навінкі вучэбнай, навуковай і метадычнай літаратуры:

Ф. М. Янкоўскі «Гістарычная граматыка беларускай мовы». У кнізе разглядаюцца гістарычныя ўмовы ўзнікнення і развіцця беларускай мовы, характарызуюцца помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці, аналізуюцца асноўныя фанетычныя змены, якія адбыліся ў розныя перыяды развіцця мовы;

«Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя». Выданне карысна тым, што ў ім можна знайсці творы вядомых і ананімных аўтараў XIX стагоддзя, вывучэнне творчасці якіх прадугледжана праграмай курса гісторыі беларускай літаратуры;

«Фанетыка беларускай літаратурнай мовы» (пад рэд. А. І. Падлужнага) утрымлівае апісанне гукавога ладу сучаснай беларускай мовы;

Аўтары артыкулаў, змешчаных у зборніку «Вывучэнне беларускай мовы і літаратуры»,— супрацоўнікі НДІ педагогікі, выкладчыкі ВНУ рэспублікі, настаўнікі — разглядаюць пытанні ўдасканалення методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры ў школе.

Усе гэтыя і іншыя выданні вы знойдзеце ў магазіне «Метадычная кніга» (вул. Берута, 22).

Т. РАДЗІКА,
таваразнаўца.

ЗНАЁМЦЕСЯ: НОВЫ ДЭКАН

«Я ПАВАЖАЮ СТУДЭНТАЎ...»

У гэтым годзе прыняў першых студэнтаў новы факультэт БДУ — філасофска-эканамічны. Праўда, «прыняў» — гэта даволі гучнае слова, бо ў «нованароджанага» няма амаль нікога і нічога (калі не лічыць трох чалавек — дэкана, яго намесніка і сакратара). Але дэкана факультэта, доктара філасофскіх навык, прафесара *Альберта Мікалаевіча ЕЛСУКОВА* ГЭТА НЕ ВЫВОДЗІЦЬ з раўнавагі. Наадварот, ён поўны аптымізму і ўпэўнены, што з часам знойдуцца не толькі пакой для дэканата, але і аўдыторыі, лабараторыі для заняткаў, навуковай работы. А пакуль давядзецца карыстацца агульнаўніверсітэцкай базай.

— Альберт Мікалаевіч, сёння вялікая ўвага надаецца выкладанню грамадскіх навук. І гэта невыпадкова. Афіцыйная статыстыка сведчыць, што моладзь дрэнна ведае гісторыю свайго народа, сваёй краіны, рэспублікі, слаба арыентуецца ў сацыяльна-палітычным жыцці. Гэта, відаць, сыграла пэўную ролю, калі вырашалася пытанне: быць ці не быць факультэту?

— Так. І гэта асноўная прычына ўтварэння новага падраздзялення ва універсітэце. Гістарычны факультэт, на якім працавалі аддзяленні філасофіі, палітэканоміі, гісторыі і гісторыі КПСС, не мог вырашыць тыя задачы, якія паставіла перабудова вышэйшай школы, новая палітыка партыі — палітыка дэмакратызацыі грамадства, стварэння аб'ектыўнага малюнка гістарычнага развіцця. Акрамя таго, даволі востра паўстала пытанне падрыхтоўкі сацыёлагаў. Сёння яны патрэбны ўсюды: на прадпрыемствах, у навучальных установах, рэдакцыях газет і часопісаў... І гэта не проста даніна модзе. Мы сапраўды ўсё часцей і часцей прыслухоўваемся да іх думкі, карыстаемся іх вывадамі і назіраннямі. Але сацыяёлагаў у нас катастрафічна не хапае. Прычым, сацыяёлагаў адукаваных, спецыялістаў сваёй справы. У іх падрыхтоўцы нам і павінен дапамагчы філасофска-эканамічны факультэт.

— А якія яшчэ аддзяленні, акрамя сацыялогіі, функцыяніруюць на факультэце?

— Мы «забралі» два аддзяленні гістарычнага факультэта: філасофіі і палітэканоміі. На іх вядзецца мэтавы набор. Дарэчы, студэнтамі гэтых аддзяленняў могуць стаць не толькі тыя, хто жыве ў СССР. Аднолькавую магчымасць маюць абітурыенты з усіх сацыялістычных краін. Вучыцца да нас прыязджаюць таксама грамадзяне з В'етнама, Нікарагуа, Кубы, Малі, Эфіопіі...

— Хацелася б даведацца, дзе будуць працаваць будучыя маладыя спецыялісты — выпускнікі-сацыёлагі?

— Гаварыць аб гэтым сёння яшчэ рана — наперадзе пяць гадоў вучобы. На працягу іх будзем старацца знайсці месца кожнаму нашаму выпускніку. А пакуль можна толькі сказаць, што на аддзяленнях філасофіі і палітэканоміі рыхтуем у асноўным выкладчыкаў ВНУ і тэхнікумаў. Для сацыёлагаў дыяпазон работы больш шырокі: ад супрацоўнікаў навукова-даследчых цэнтраў АН БССР і нашага універсітэта — да штатных сацыяёлагаў на прыдпрыемствах.

— А стыпендыяльнае забеспячэнне?..

— Пакуль па звычайнаму фонду. У перспектыве (гэта датычыць аддзялення сацыялогіі) плануем укараніць такі (даволі прагрэсіўны) метад: прадпрыемства заказвае неабходную колькасць спецыялістаў і аплачвае іх падрыхтоўку.

— Не так даўно Дзяржкамітэт па народнай адукацыі выдаў загад «Аб перабудове выкладання грамадскіх навук у вышэйшых навучальных установах краіны». Як гэты дакумент будзе ўплываць на арганізацыю вучэбнага працэсу на Вашым факультэце?

— Адразу адзначу, што зменіцца не толькі назва курсаў, але і іх змест. Гэта выклікана тымі рэвалюцыйнымі працэсамі, якія адбываюцца сёння ў выкладанні грамадскіх навук. І ў першую чаргу — пераарыентацыя з вузкаклясавага падыходу ў вывучэнні дысцыплін да агульначалавечага. Напрыклад, што датычыць філасофіі, то яна будзе называцца не марксісцка-ленінская, а проста філасофія. Не будзе больш падзелу гэтай навукі на дыялетктычны і гістарычны матэрыялізм — студэнтам прапануюць агульны курс філасофіі як адзінай цэласнай дысцыпліны. У адпаведнасці з новымі праграмамі больш увагі будзе ўдзяляцца агульнафіласофскім праблемам: быцця, агульначалавечай культуры і цывілізацыі. Жыццё патрабуе ад нас новага падыходу да вывучэння палітэканоміі. Капіталізм і сацыялізм як сістэмы павінны паказвацца ў крытычным, параўнаўчым плане. Радыкальныя змены адбудуцца ў выкладанні гісторыі. Замест курса «Гісторыя КПСС» уводзіцца новы — «Сацыяльна-палітычная гісторыя XX стагоддзя».

— Усе гэтыя змены, безумоўна, створаць і новыя цяжкасці. Адна з іх існуе ўжо зараз — недахоп праграм і падручнікаў.

— Ніхто, як кажуць, не гоніць хутчэй пераходзіць на новае выкладанне. Можна пачакаць, пакуль неабходны вучэбны матэрыял будзе падрыхтаваны. Дзяржкамітэт абяцае зрабіць гэта праз год-паўтара. Але ж час ідзе, а аб'ектыўнай карціны пакуль няма. Змяняюцца студэнты, і яны па-ранейшаму ідуць у жыццё са старымі ўяўленнямі, з «учарашнімі» ведамі. Таму патрэбна спяшацца. Выкладчыкі павінны самі перапрацаваць і адкарэкціраваць канспекты, пабудаваць лекцыі на аснове сучасных даных.

— Альберт Мікалаевіч, вядома, што якась падрыхтоўкі маладых спецыялістаў залежыць ад узроўню выкладання. Ці змогуць самі студэнты рэгуляваць гэты ўзровень?

— Гэта ў іх сілах. Пасля заканчэння кожнага семестра студэнты адказваюць на пытанні спецыяльнай анкеты, якія датычаць узроўню выкладання таго ці іншага курса. Калі ацэнкі іх будуць не вельмі высокія, то ў выкладчыка ёсць «шанц» не прайсці па конкурсу. Акрамя таго, пытанне аб узроўні выкладання студэнты могуць узняць на вучоным савеце, які займаецца выбраннем па конкурсу.

— Дарэчы, а як выбіралі дэкана?

— На жаль, я вас расчарую — дэкана не выбіралі, а прызначалі. Але на гэта ёсць аб'ектыўныя прычыны. Вы ведаеце, як праводзяцца выбары: кафедры прапануюць кандыдатуры, савет факультэта, студэнты іх абмяркоўваюць... А ў нас пакуль няма ні кафедраў, ні савета.

Але недзе праз паўгода-год абавязкова будзе аб'яўлены конкурс і пройдуць выбары дэкана.

— Яшчэ адна «прыкмета» перабудовы вышэйшай школы — вольнае наведванне лекцый. Ці мяркуеце Вы ашчаслівіць сваіх студэнтаў?

— Я лічу, што вольнае наведванне неабходна. Але апошнім часам яно набывае анархічны характар: кожны студэнт сам вырашае, на якую лекцыю яму хадзіць, на якую не. А ў выніку ігнаруе ўсё. Таму гэта «свабода» павінна быць афіцыйна аформлена заявай студэнта і адпаведным рашэннем дэканата. Вольнае наведванне — не выказванне волі студэнта, а вынік яго працы.

— Альберт Мікалаевіч, апошняе пытанне датычыць асабіста Вас. Ваш факультэт, як і кожны нованароджаны, патрабуе шмат сіл, энергіі, вопыту, не апошняя справа і арганізатарскія здольнасці. Як Вы лічыце, ці валодаеце гэтымі якасцямі?

— Хваліць сябе неяк нясціпла. Але калі вы спыталі пра гэта, мушу адказваць. Ведаеце, пытанне з дэканам вырашалася вельмі доўга і цяжка. Было шмат кандыдатур. І, лічу, нядрэнных. Але выбар выпаў на мяне. Як, напэўна, і кожны чалавек, я таксама адразу сумняваўся, ці здолею.Але сёння тое, што ўжо зроблена (а даводзілася пачынаць, як кажуць, з нуля), дае ўпэўненасць, што гэта ноша мне пад сілу.

Я паважаю студэнтаў, і разумею іх патрэбы. А таму, думаю, мы знойдзем агульную мову.

Інтэрв'ю правяла
З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

ФОТА Ў НУМАР

Розныя людзі ацэняць яго ўчынак па-рознаму. Адны абвінавацяць у празмернай упэўненасці ў сабе, другія выкажуць захапленне смеласцю такога крока, хтосьці, магчыма, назаве дзівацтвам. А што думае наконт гэтага сам ён, студэнт IV курса юрыдычнага факультэта Сяргей Рак? Ён прапанаваў сваю кандыдатуру для работы на Студэнцкім форуме. І зараз чакае вынікаў, якія прынясуць выбары.

Некалькі сапернікаў Сяргея, таксама кандыдаты ў дэлегаты на форум, 6 кастрычніка былі гасцямі «Беларускага універсітэта».

Матэрыялы прэс-канферэнцыі чытайце на 2-й старонцы!

А Ў ВАС?
А Ў НАС!

АРЫЕНЦІР — КАТАНІ?

◆

У родныя пенаты вярнуліся «армейцы». Гэта катэгорыя студэнтаў патрабуе своеасаблівага падыходу з боку ўсіх тых, хто прымае іх у факультэцкіх сценах.

◆

Радыёфізічны факультэт можна лічыць першым у кардынальных зменах вучэбнай праграмы. Цяпер радыёфізікі будуць вучыцца амаль так, як іх равеснікі ў перадавых вышэйшых навучальных установах краіны — МДУ і МФТІ. Уведзены новыя прадметы: лічбавая электроніка, матэматычнае мадэляванне і іншыя. Вядома, два гады, аддадзеныя вялікай часткай студэнтаў выкананню ганаровага абавязку кожнага грамадзяніна СССР, могуць стаць сур'ёзнай перашкодай для вучобы ў такім высокім тэмпе, які прапанавалі будучым радыёфізікам. Штодзень дзевяць вучэбных гадзін, куды ўваходзяць значна скарочаныя тэарэтычныя курсы, праца на персанальных ЭВМ і індывідуальная падрыхтоўка. Існуе даволі трывалае меркаванне, што «армейцу» не да вучобы...

— Мы вельмі задаволены нашымі «армейцамі»,— адразу паведаміў намеснік дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі Яўген Іванавіч Боўбель.— Наведванне дадатковых заняткаў, спецыяльна арганізаваных для «армейцаў», было амаль стопрацэнтным. Па гэтых чатырох гадзінах грунтоўнага паўтарэння асноўных прадметаў адноўленыя студэнты будуць зараз здаваць залікі. Як гэта ні банальна гучыць, адчуваецца прага да ведаў. Сумавалі, мабыць, нашы «армейцы» па такіх вучэбных курсах, як тэорыя хвалевых працэсаў, атамная ядзерная фізіка.

«Армейцы» III курса факультэта радыёфізікі і электронікі Уладзімір Квяткевіч і Ігар Краўцоў засведчылі, што выкладчыкі па гэтых прадметах Ігар Цімафеевіч Краўчанка і Генадзь Іванавіч Папко асабліва цёпла прымаюцца імі. Свае лекцыі яны заўсёды пачынаюць з грунтоўнага паўтарэння пройдзенага матэрыялу. Такі варыянт вучобы, як «вось ураўненне, вось яго рашэнне. Вывад вы, безумоўна, памятаеце, мы яго рабілі год назад» ніколі не сустракаўся ў іх практыцы навучання. Ігар і Уладзімір самым сур'ёзным чынам выступаюць за патрабавальнасць: «Лёгка цяпер ідзе вучоба па тых прадметах, выкладчыкі якіх да службы ў арміі ад нас нешта патрабавалі. Вядома, мы, як і ўсе звычайныя студэнты, былі пакрыўджаны ў светлых вольналюбівых пачуццях. А цяпер тыя «прымусовыя» веды вельмі дарэчы.

Апошняе пытанне, якое я задаў Яўгену Мікалаевічу, было такое: «Які арыенцір, паказчык якаснага ведання паўторнага матэрыялу ў «армейцаў»?

— Здадзеныя залікі,— адказаў Я. І. Боўбель.— Пакуль усё ідзе без надзвычайных здарэнняў.

Аналагічнае пытанне было зададзена Ігару і Уладзіміру некалькі тыдняў назад. Таму яны назвалі арыенцірам сваёй вучобы камісара Катані. Гэта значыць, працуюць яны да прагляду фільма «Спрут». З ранку да познага вечара. Як у народных казках пра працаздольных беднякоў.

А. КОКТЫШ.

ПАРЫ З КАТЛА НЕ ВЫПУСКАЦЬ!

Медыкі сведчаць: студэнт, нарэшце, прачнуўся. Агледзеўся і вынес прысуд навакольнаму: «Далоў пасіўнасць!» Словам, пераўтварыўся.

Прачнуўся? Пераўтварыўся?? Магчыма. Мы ж пакуль не адчулі. Жадаючых апынуцца на Студэнцкім форуме знайшлося ва універсітэце няшмат. Як і ўдзельнікаў прэс-канферэнцыі з кандыдатамі ў дэлегаты: Пётр Доўгі, Уладзімір Хвалей, Ігар Хіжняк. Пытанні задавалі: Віктар Шадурскі, сакратар камітэта камсамола універсітэта, Ігар Верхаводзька, сакратар камітэта камсамола юрфака, штатныя і няштатныя карэспандэнты «Беларускага універсітэта».

САМАРЭКЛАМА

Пётр ДОЎГІ: Што я магу сказаць? Яшчэ ў школьныя гады цікавіўся палітыкай. Пасля паступлення ва універсітэт пачаў прымаць удзел у нефармальным руху. Складаю вершы, адзін сёння прачытаю.

БРЫДКА

Сярод пустэльнасці падзей,
Сярод варожасці сцюдзёнай
Мне непрыемны смак касцей,
Што кідаюць людзям
штодзённа.
І цяжка мне, на раны соль
Ссыпаючы, усміхацца міла,
Душэўны людзям несці боль
І рабалепства перад сілай.
Сярод бяссэнсавасці дзён
Гаворым мы аб чымсьці
ўзнёслым.
Мы выкрываем злы прыгон
І новыя чакаем вёсны.
У сне ж з пагардай мы
крычым
Зло выкрываем смела,
жорстка.
Але прачнуўшыся ў начы,
Мы заўважаем: вугал, костка.
Боль ад сябе не адлучыць,
І зноў нібы з глыбінь астрога
Пытанне вечнае гучыць:
«У чым вінаваты мы прад
богам?»

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Не хачу, каб гэта была чарговая гульня ў дэмакратыю, чарговае выпусканне пары з катла. Жадаю, каб былі прыняты рэальныя рашэнні, якія магчыма будзе ажыццявіць, каб студэнты адчулі карысць ад таго, што адбудзецца.

Ігар ХІЖНЯК: Мой сябар-сапернік амаль што на 90 працэнтаў выказаў і мае меркаванні. Я хачу яшчэ, каб форум зрабіў першы крок у стварэнні студэнцкай арганізацыі. Гэта не павінна быць нейкая складаная, цэнтралізаваная арганізацыя з заблытанай іерархічнай структурай. Гэта арганізацыя, якая будзе змагацца за інтарэсы студэнтаў. Ні ў якім разе не альтэрнатыва камсамолу.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Ты хочаш стварыць самастойную студэнцкую арганізацыю і разам з тым не супрацьпастаўляць яе камсамолу?

Ігар ХІЖНЯК: Гэта не палітычная арганізацыя. Сёння камсамол не здольны вырашыць усе існуючыя праблемы. Успомнім, напрыклад, што сярод членаў вучоных саветаў з'явіліся студэнты, але сваёй сур'ёзнай арганізацыі тут яны не маюць. Ці такая праблема: я ўжо другі год у камітэце камсамола факультэта і паспеў заўважыць, што большасць мерапрыемстваў, якія ў нас праводзяцца, не палітычныя, а студэнцкія. Давайце паступова пераходзіць да нармальнага стану рэчаў: камсамол будзе пераважна займацца палітычнымі праблемамі, а студэнцкая арганізацыя — студэнцкімі. Камсамол не павінен знікнуць, хоць яго папулярнасць і зніжаецца, ён павінен заняць сваё месца.

Пётр ДОЎГІ: Я чакаю, што форум прыме менавіта маю праграму.

Я супраць палавінчатых рашэнняў. Мне здаецца, што форум склікаецца, каб кардынальна палепшыць перш за ўсё становішча нашай адукацыі. Я прааналізаваў, чаму ў студэнтаў няма жадання вучыцца. У іх шмат фальшывых каштоўнасцей: напрыклад, атрыманне дыплома, добрых адзнак. Каб галоўнай мэтай сталі веды, трэба, па-першае, адмяніць размеркаванне, па-другое, больш людзей прымаць у ВНУ і забяспечваць на першым-другім курсах жорсткі адбор. Калі студэнтаў будзе менш, з'явіцца магчымасць выбару выкладчыкаў, значыць, палепшыцца якасць выкладання.

Па сутнасці, я прапаную заходнюю сістэму навучання.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Крыху пра сваю канцэпцыю і адначасова крытыка пазіцыі майго апанента. Яго праграма, на мой погляд, аддае тым, з чым мы зараз змагаемся,— ведамасным падыходам, абаронай інтарэсаў вузкага кола людзей. З пункту гледжання студэнцтва — гэта цудоўна, адмена размеркавання. Але ж хто тады будзе працаваць на раёне, калі ўсе ў горадзе застануцца? Такія рашэнні трэба прымаць у комплексе. Немагчыма змяніць становішча ўнутры студэнцтва, калі не адбудуцца перамены ў грамадстве наогул.

Мая канцэпцыя больш лаяльная ў адносінах да дзейнічаючай структуры. Я лічу сябе рэфарматарам. Мы пакуль павінны рухацца паступовымі крокамі. Узровень нашай дэмакратыі, узровень свядомасці студэнтаў яшчэ не настолькі высокі, каб разлічваць: калі на форуме будзе прынята ідэя аб стварэнні новай арганізацыі, дык яна будзе падхоплена на месцах. Нават скліканне форума не ўсюды ідзе знізу, у некаторых месцах — толькі ад аргкамітэта, зверху.

Я таксама за існаванне арганізацыі, якая будзе абараняць правы студэнтаў. Але, на мой погляд, гэта павінна быць не прынцыпова новая арганізацыя, а старая з новымі функцыямі.

Пётр ДОЎГІ: Мяне абвінавацілі ў вузкаведамасным падыходзе. А я ж наадварот за больш цяжкія ўмовы для студэнтаў. Мая платформа накіравана на тое перш за ўсё, каб падрыхтаваць добрых спецыялістаў. А як заманіць іх у сяло — гэта ўжо задача не студэнцкіх арганізацый. Нам патрэбна вырашаць сваё.

Віктар ШАДУРСКІ: У мяне пытанне да Ігара Хіжняка. Ты выступаеш за стварэнне студэнцкай арганізацыі, функцыі якой шмат у чым сугучныя задачам прафсаюзаў. А як, на твой погляд, адбудзецца раз'яднанне функцый цяперашніх прафсаюзаў і гэтай арганізацыі?

Ігар ХІЖНЯК: Я думаю, тут трэба ўлічваць рэальную сітуацыю. Далёка не адразу новая студэнцкая арганізацыя зможа адабраць «чужыя» функцыі. Яе структура павінна быць іншай. Чым займаюцца зараз у нас прафсаюзы? Выдзяляюць матэрыяльную дапамогу, талоны на льготнае харчаванне, пуцёўкі ў прафілакторый, у санаторыі. Гэта проста функцыі пераразмеркавання сродкаў: з агульнай кішэні тым, хто асабліва адчувае ў іх патрэбу. Я не магу сказаць, што сёння нашы прафсаюзы займаюцца яшчэ нечым...

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Я вяртаюся да пытання аб стварэнні студэнцкай арганізацыі. Яна будзе дзейнічаць для абароны правоў студэнтаў, любых студэнтаў, нават самых дрэнных. А змагацца за тое, каб кожны студэнт стаў сапраўдным спецыялістам, павінен, напрыклад, Дзяржкамітэт па народнай адукацыі, гэта яго справа.

Пётр ДОЎГІ: Студэнцкая арганізацыя павінна мець права патрабаваць ад гэтага камітэта...

Яна можа выбраць лепшых студэнтаў, прымусіць іх самастойна знайсці сабе месца работы, гэта значыць, зацікавіць іх у атрыманні ведаў, а не добрых адзнак.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Атрымліваецца, што студэнцкая арганізацыя павінна выконваць ролю каардынатара на рынку працоўных рэсурсаў. А ці не здаецца вам, што мы занадта моцна замахнуліся? Не зламаўшы нашу камандна-адміністратыўную сістэму (ВНУ — адно з яе звенняў), мы спрабуем укусіць яе за хвост.

Пётр ДОЎГІ: Які ж тады сэнс мае скліканне форума?

САМАРЭКЛАМА

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Мне надакучыла жыць у доме для вар'ятаў, дзе пануюць ненармальныя чалавечыя і эканамічныя адносіны. Усё пастаўлена з ног на галаву. Я адчуваю, што не змагу ў ім жыць. Таму мне не дадзена трэцяга выйсця: альбо я ўношу свой варыянт логікі і розуму ў жыццё гэтага дома, альбо ператвараюся ў такога ж вар'ята, як і ўсе астатнія. Я — прыхільнік рэфармастарства.

Асабістыя захапленні: жанаты, ёсць сын. Люблю іграць на гітары (для сябе). Здараецца, пакурваю. Цікаўлюся дзейнасцю грамадскіх арганізацый. Хобі — вывучэнне самога грамадства.

Ігар ВЕРХАВОДЗЬКА: Ва ўсялякім выпадку ён адбудзецца не для таго, каб абвясціць сусветную рэвалюцыю.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Мы не хочам, каб форум стаў гульнёй у дэмакратыю. Але можа атрымацца менавіта так. Мы прыйдзем, абвясцім: «Далоў размеркаванне!» Але паедзем адтуль, а ўсё застанецца па-ранейшаму.

Ігар ХІЖНЯК: Але ж мы не прапануем адмяніць размеркаванне ўжо заўтра. Гэта перспектыўная мэта. Можна зрабіць гэта, напрыклад, праз пяць год.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: А хто вырашае — адмяняць размеркаванне ці не?

Ігар ХІЖНЯК: Зразумела, не мы. Мы можам толькі прапаноўваць, патрабаваць.

Віктар ШАДУРСКІ: Такая мера, як адмена размеркавання,— гэта спроба вырваць ВНУ з ланцуга існуючых праблем. Гэта немагчыма, бо не можа быць чыста універсітэцкай, унутранай сістэмы.

Пётр ДОЎГІ: Мы і не прапануем ствараць яе. Але ж з чагосьці трэба пачынаць дэманціраваць існуючую ў нас сістэму.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Пажадана — з галавы.

Пётр ДОЎГІ: Адукацыя і ёсць такая галава, з якой трэба пачынаць.

Ігар ВЕРХАВОДЗЬКА: Як я зразумеў, асноўная ўвага ў праграмах Ігара і Пятра надаецца стварэнню студэнцкай арганізацыі, якая будзе займацца вырашэннем студэнцкіх праблем, але не самому рашэнню гэтых праблем, напрыклад, такіх канкрэтных, як «ваенка», «бульба».

Пётр ДОЎГІ: Да гэтага проста не дайшла размова. Я лічу, што «бульба» і «ваенка» не садзейнічаюць фарміраванню добрага спецыяліста, таму павінны быць адменены.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Калі мы ў бліжэйшыя гады не будзем пасылаць студэнтаў на «бульбу», дык нам давядзецца сесці на галодны паёк. Але патрэбны прынцыпова новы падыход да гэтага пытання. Гаспадаркі павінны ствараць адпаведныя ўмовы пражывання, забяспечваць добрую аплату працы. І галоўнае — усё павінна быць абсалютна добраахвотна, каб студэнт сам выбіраў, ехаць яму на «бульбу», у будатрад ці прыемна бавіць час дома.

Што датычыць «ваенкі», мне здаецца, адзін дзень у тыдзень на старэйшых курсах павінен ёй адводзіцца. Але зноў жа толькі па жаданню студэнта.

Ігар ХІЖНЯК: Хачу дадаць, што ні ў якім выпадку не павінна паўтарыцца сітуацыя, як у гэтым годзе, калі студэнты пасля працы ў будатрадзе вымушаны былі ехаць на «бульбу».

Віктар ШАДУРСКІ: А як вы ў сувязі з гэтым ставіцеся да ідэі аб'явіць студэнцкія канікулы ў жніўні-верасні?

Ігар ХІЖНЯК: Ва ўсіх заходніх краінах так і ёсць. Трэба падумаць пра гэта і нам. Магчыма, прадугледзець розныя варыянты для розных курсаў.

Віктар ШАДУРСКІ: А што вы, як кандыдаты, можаце сказаць пра ідэю «скліканння» міні-форума для пяці дэлегатаў ад універсітэта?

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Безумоўна, гэта патрэбна. За два-тры дні, у якія будзе праводзіцца форум, вырашыць усе канкрэтныя пытанні проста немагчыма. Таму ўнутраныя рознагалоссі неабходна ўрэгуляваць раней.

САМАРЭКЛАМА



Ігар ХІЖНЯК: Мне цяжка сказаць што-небудзь новае пасля рэкламных маналогаў маіх сапернікаў. Акрамя таго, што я не паспеў ажаніцца, не маю дзяцей, не куру. Словам, усё, як у папярэдніка, толькі з адмаўленнем.

Па характару я чалавек не тое, каб кансерватыўны, але памяркоўны. Як пісаў у свой час К. Маркс: «Быць радыкальным — гэта азначае разумець праблему ў корані». Вось менавіта такі радыкалізм блізкі мне. У супрацьлеглым выпадку я — кансерватар.

Ігар ХІЖНЯК: Я не ўпэўнены, што патрэбна выпрацоўваць маналітную праграму дэлегатам ад універсітэта. Гэта можа проста не атрымацца. Улічыце, што будуць абраны людзі, якія маюць розныя пункты гледжання, часам палярныя. На міні-форуме з'явіцца магчымасць іх выказаць.

КАР.: Ці не баіцеся вы расчаравацца, пабываўшы на форуме? Раптам ён не спраўдзіць вашы спадзяванні?

Ігар ХІЖНЯК: Вельмі баюся. І буду імкнуцца да таго, каб спраўдзіліся.

Пётр ДОЎГІ: Не баюся, бо ў многім ужо давялося расчаравацца.

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Усё, што адбудзецца на форуме, прывядзе да лепшага.

КАР: Чаго не можа сёння студэнт і на што будзе здольны пасля форума?

Уладзімір ХВАЛЕЙ: Мне здаецца, шмат чаго мы не можам, і пасля форума сітуацыя не зменіцца, акрамя аднаго: студэнт атрымае магчымасць стварыць сваю арганізацыю, якая б ахоўвала яго правы.

Прамую сувязь з чытачом арганізоўвалі:
Вераніка БЯГУН,
Марына ЗАГОРСКАЯ.

«ДАЙ СПІСАЦЬ!»

Здаралася, вучэбная аўдыторыя нагадвала мне трамвай. Быццам бы ўтульны, ветлівы і ўсё ж адчужана халодны. Просьбы «дай ручку», «вярні канспект», «дай спісаць» і пытанні: «А калі наступная лекцыя?» — гучалі не радзей, чым трамвайнае: «Перадайце квіточак!» Вось так: ад прыпынку да наступнага. Усе пяць гадоў вучобы. Часам, заканчваючы інстытут, студэнты амаль нічога не ведаюць адзін пра аднаго. Няма адной ідэі, якая б аб'яднала ўсю групу. І на семінарах, бывае, не атрымліваецца размова не таму, што студэнты прадмета не ведаюць, а з прычыны малой зацікаўленасці ім.

Калі б мне дазволілі прапанаваць сваю мадэль студэнцкай групы, я аддала б перавагу спецсемінарам, якія аб'ядноўваюць людзей, інтарэсы якіх больш-менш супадаюць.

Акадэмічныя групы фарміруюцца ў самым пачатку навучання. Спецсемінары пазней, калі студэнты самі выбіраюць сабе тэму, род заняткаў. Разумею, фарміраваць групы патрэбна на першым курсе. Ці так неабходна прытрымлівацца алфавіта? Магчыма, карысней увесці сістэму тэстыравання, ці да трэцяга курса, калі пачынаецца спецыялізацыя, пераглядаць састаў груп? Я згодна на любую рэформу, толькі б для таго, хто прыйдзе ў маю аўдыторыю у гэтым годзе зацікаўленая гутарка не падмянялася просьбаю спісаць.

В. КАРАЛЕНКА,
выпускніца.

КАВЕРЗНАЕ ПЫТАННЕ

— Калі вы не трапіце ў пяцёрку «шчасліўчыкаў», ці прапануеце палажэнні сваіх праграм на абмеркаванне студэнцкай фракцыі універсітэта?

Ігар ХІЖНЯК: *Калі дэлегатам будзе абраны чалавек, праграма якога блізкая мне, — так. А калі сустрэну апанента не толькі як канкурэнта на выбарах, але і ў ідэалагічным плане...*

Пётр ДОЎГІ: *Безумоўна, прапаную сваю дапамогу.*

Уладзімір ХВАЛЕЙ: *А я — не. Іншая справа, калі да мяне звернуцца за дапамогай. Чаму? Я давяраю сваім выбаршчыкам: калі ім спадабаўся іншы чалавек — значыць, яго праграма лепшая за маю.*

— Усе вы негатыўна ацэньваеце існуючую сістэму. Што самае адмоўнае атрымалі вы ў спадчыну да яе?

Пётр ДОЎГІ: *Скаванасць.*

Уладзімір ХВАЛЕЙ: *Самы адмоўны момант — бессістэмнасць. Няма адзінага правільнага падыходу. Мы не бачым канкрэтнай мэты, таму не маем права выбару. Здараецца, атрымліваем шмат непатрэбнага і страчваем самае важнае.*

Ігар ХІЖНЯК: *Акрамя скаванасці, догмы і стэрэатыпы. Значную колькасць тых, што старанна закладвалі ў мяне на працягу першых 17—18 гадоў жыцця, я ўжо выкараніў, пераадолеў. Часам заўважаю, што чамусьці нешта яшчэ засталося.*

— Які працэнт у вашым жаданні паехаць на форум належыць славалюбству?

Ігар ХІЖНЯК: *Зразумела, яно адыгрывае сваю ролю. Але якую? Гэта не жаданне ўбачыць Свой партрэт у газеце. Меней за ўсё. Славалюбства не ў тым, каб мяне пазнавалі на вуліцы, хутчэй, яно дадае ўпэўненасці ў сабе, у сваіх сілах.*

Уладзімір ХВАЛЕЙ: *Мяне, хутчэй за ўсё, хвалююць тыя працэсы, якія адбываюцца. Я не жадаю, каб Студэнцкі Савет (калі такі будзе створаны) быў лявацкай арганізацыяй. Я лічу, што большменш уяўляю сабе сітуацыю ў студэнцкім прафсаюзе і, як мне здаецца, сітуацыю ў грамадстве. Хачу прапанаваць тую канцэпцыю, якая здаецца мне найбольш рэальнай у дадзены момант.*

Пётр ДОЎГІ: *Я вырашыў ехаць на Студэнцкі форум толькі таму, што маю сваю пазіцыю і хачу выказаць яе. А славалюбства... Больш важна, каб разумелі і паважалі мяне сябры.*

Сёння мы запрашаем вас азірнуцца крыху назад. Ацаніць тое, што зрабілі, прааналізаваць свае пралікі і памылкі. Безумоўна, надта саманадзейна было б спадзявацца, што пасля публікацыі гэтай падборкі матэрыялаў усё адразу зменіцца ў лепшы бок. І ўсё ж мы змяшчаем іх. З надзеяй на тое, што яны дапамогуць па-ранейшаму ярка засвяціць «Стэлуцы», наблізіць пераломны момант у арганізацыі педагагічных СА, узняць прэстыж атрадаў «мясцовага» прызначэння...

«ДЗЕЦІ — НАША МІНУЛАЕ»

З ДЗЁННІКА ВАЖАТАГА

21.VII.89 г.

Цвёрда вырашыў паспытаць важацкага шчасця на летніх вакацыях. Насуперак усім аб'явам і заклікам камітэта камсамола накшталт: «Педатрад — ваш лёс» — «дзікуном». У мінулым годзе на сабе адчуў «падарункі» гэтага лёсу, якія ў сухой фармулёўцы выглядаюць наступным чынам: «Падрыхтоўка і фарміраванне студэнцкіх атрадаў педагагічнага профілю ў ВНУ праводзіцца на недастатковым узроўні. Педатрады фарміруюцца стыхійна...» На практыцы гэта азначала: адміністрацыя піянерскага лагера зусім не лічыла нас знаходкай, хутчэй таннай працоўнай сілай, якая да таго ж будзе здольна маўкліва сцярэць звестку: «Хлопцы, нас жа аблічылі!»

Маці, настаўніца рускай мовы і літаратуры, іранічна агледзела мяне. На ўсялякі выпадак прапанавала «Займальную граматыку» — усё ж больш карысці, чым ад традыцыйнай вучобы ў «набітых» аўдыторыях пры агульным дэфіцыце часу і лектараў, і слухачоў.

23.VII.89 г.

Санаторый — піянерскі лагер Савейкі. Былы панскі маёнтак. Прыгожы парк (у мінулым, вядома). Сажалка (у мінулым таксама). Цяпер — яма з брудной вадой, качкі замест лебедзяў. Цудоўныя мясціны.

Не паспеў расправіць плечы ад дарожнага рукзака, як сутыкнуўся з прадстаўніцай майго выхавацельскага кантынгенту:

— Ты ў нас важатым будзеш? Я цябе на Вы называць не стану. Папярэджваю.

Вось так. Адкрытым тэкстам перакрэсліла ўсе мае педагагічныя здольнасці. І выйшла. Яе звалі Ала.

26.VII.89 г.

Бальніца. Самая звычайная бальніца. Са сваім спецыфічным пахам, фанабэрыстымі дактарамі, баязлівымі медсёстрамі і самаўпэўненымі санітаркамі з дыктатарскімі замашкамі.

Касцёр — нельга, спортінвентару патрэбнага не хапае, дзеці не ведаюць, куды сябе дзець... Адміністрацыя нічога не заўважае, быццам у яе кампетэнцыі толькі чысціня лагернай плошчы і смачна сваечасовы абед. Праўда, дайшлі ў яе рукі і да нашай выхаваўчай дзейнасці, дакладней, асабістага жыцця. Прадстаўнікоў адміністрацыі дзеці не любяць. Адну называюць Кабаніхай.

27.VII.89 г.

Нашы абавязкі — чым-небудзь заняць дзетак з васьмі трыццаці да дваццаці дзвюх. І правесці зарадку. Астатні час ідзе на працэдуры, агляд урача, ціхі час. Увогуле, дзеці хочуць разгарнуцца. Няма нават валейбольнага мяча. Няма пляцоўкі, няма рэчкі, няма спартыўнага інвентару.

2.VIII.89 г.

Праводзілі конкурс «Міс адпачываючы-89». Мае насіліся цэлы тыдзень. Прычоскі, вячэрнія сукенкі, паходка, танцы — усё ж трэба паспець.

Удзельнічалі ў асноўным малыя. Старэйшыя баяліся «прагарэць». У мінулай зменне мая знаёмая Ала была, бясспрэчна, першай. Цяпер жа не ўвайшла нават у тройку. Слёзы, ледзь не істэрыка. І ўсё гэта даніна модзе? Дзе яны — добрыя старыя піянерскія конкурсы?

10.VIII.89 г.

Галоўнае, як нас запэўніваюць,— здароўе дзяцей. Адпрацаваная, састарэлая сістэма. Але ж... Не цяжка вучыць і выхоўваць дзяцей — цяжка гэтаму навучыцца. Аб неабходнасці нешта ведаць, не разгубіцца і знайсці выйсце з самай складанай педагагічнай сітуацыі студэнтам ніхто не гаворыць. «Плюнь на ўсё»,— прапанаваў мой напарнік Віця з Мазырскага пединстытута.

Я ад'язджаю. Віця ўсміхаецца напаследак і з бачнай палёгкай уздыхае: «Дзеці — наша мінулае». Я падумаў: «Не, хутчэй усё ж такі будучае». Як і паўнацэнная педагагічная падрыхтоўка студэнтаў педагагічных ВНУ і педатрадаў.

А. АСТАПАЎ.

ЦІ БУДЗЕ СВЯЦІЦЬ «СТЭЛУЦА»?

А сёння ёй прама ў вочы кідаюць: «Нашто нам ваша «Стэлуца»? На спякоце душыцца, гнуць спіну дзеля рубля?

Для «Стэлуцы» гэтыя два летнія месяцы — як ззяючая вяршыня, да якой з цяжкасцю давялося прадзірацца скрозь нагрувашчванне перашкод і бар'ераў.

Цяжкасці фарміравання студэнцкіх атрадаў на мехмаце дзякуючы актыўнаму супрацьдзеянню факультэцкага кіраўніцтва — праблема не новая. У мінулым годзе пра яе пісала наша газета і рэспубліканская «Чырвоная змена», аднак...

— Падрыхтоўчы перыяд у гэтым годзе быў надзвычай цяжкім,— расказвае камандзір «Стэлуцы», ветэран будатрадаўскага руху Іна Макаранка,— столькі ўсяго нагарадзілі, уся работа па арганізацыі — бесперастаннае пераадоленне нечага. Калі раней СБА фарміраваліся валявым рашэннем і ў іх запісвалі прымусова, то зараз уся палітыка дэкана факультэта Л. П. Прымачука накіравана на зварочванне студатрадаўскага руху. План праходжання вытворчай і педагагічнай практыкі складзены так, што непазбежны накладкі, а пра яе перанос байцам СА дэкан і слухаць не хоча. Галоўнае для нас — вучоба.

Канфлікт з дэканатам — справа небяспечная, таму рэзка скарацілася колькасць жадаючых запісацца ў атрады.

У голасе Іны і абурэнне, і боль. Яна памятае лепшыя гады «Стэлуцы», калі туды ірваліся ўсе. А сёння ёй у вочы кідаюць: «Навошта ваша «Стэлуца»? На спякоце душыцца, гнуць спіну дзеля рубля? І так не бедныя, лепш на пляжы паваляцца...» Падае аўтарытэт будатрадаў, і ў гэтым дапамагае дэканат.

Навошта студэнт едзе ў студатрад? Пытанне не новае. Нехта скажа: прыкметна паправіць сямейны бюджэт, і будзе правы, як і той, хто заўважыць, што за рамантыкай і новымі сябрамі. А як яна дабываецца, гэта рамантыка? Як іх знаходзіш, новых сяброў? Я ніводнага разу не апранаў студатрадаўскай курткі, але зразумець гэта мне дапамагла «Стэлуца».

За нялёгкай і настойлівай працай у полі хаваецца нешта больш сур'ёзнае, чым жаданне добра зарабіць. Наша сённяшняя сярэдняя школа выпускае ў жыццё маладых людзей, якія вельмі часта не ўмеюць жыць у калектыве, наладжваць адносіны з аднагодкамі. Таму патрэбна даражыць такімі калектывамі, як «Стэлуца». Тут першыя ломкі сябе, калі «трэба» — і ўсё тут, тут вымалёўваецца, хто што можа, тут вучацца падпарадкоўваць сябе калектыву. Так, нам патрэбна выдатная вучоба студэнтаў, яна залог таго, што краіна атрымае адукаваных спецыялістаў, але будзь ты хоць якім майстрам сваёй справы, калі не можаш наладзіць адносіны з калегамі па рабоце і твая самастойнасць распаўсюджваецца не далей выбару капусты ці супа на абед,— грош табе цана.



Сярод будучых выпускніцаў мехмата — педагогі-матэматыкі. Іх чакае работа з падлеткавымі калектывамі. Для гэтага педпрактыкі малавата, на тэорыі з падручніка не выедзеш, патрэбна быць асобай. Я ўпэўнены, два летнія месяцы ў «Стэлуцы» — гэта вельмі важны этап у фарміраванні такіх асоб.

Хвалюе пытанне: ці так неабходна непахіснасць тэрмінаў праходжання практыкі і прыцягнення да «бульбы» студатрадаўцаў? Намеснік дэкана Аркадзь Аляксеевіч Шарамет сітуацыі не высветліў:

— Вучэбны працэс ёсць вучэбны працэс. Пасля другога курса ўвялі вытворчую практыку, якая абавязковая, і студэнты праходзяць яе ў Інстытуце кібернетыкі, Інстытуце матэматыкі, іншых арганізацыях. Прайсці яе на працягу навучальнага года немагчыма. Да таго ж на сельгаспрацы зараз будуць ездзіць толькі другія курсы, і мы не зможам вызваліць другакурснікаў-студатрадаўцаў. Таму што атрымаецца накладна іншым.

Усе цяжкасці і праблемы «Стэлуцы» у аднолькавай ступені характэрны яшчэ тром фарміраваным у гэтым годзе атрадам — «Зорнаму», «Расінцы», «Гарызонту». Факультэт жа адзін.

«Стэлуцу» ведаюць, памятаюць і вельмі любяць многія пакаленні студэнтаў. Гісторыя атрада памятае выпадкі (не такія даўнішнія), калі байцамі станавіліся ўжо пасля атрымання дыплома. Пры развітанні яны плачуць, для іх «Стэлуца» — круглы год, таму што яны жывуць па формуле: першыя паўгода — яшчэ тут, другія —у «Стэлуцы». І, думаецца, нікому з дэканата не хочацца, каб студэнты, пачуўшы яго прозвішча, дадавалі: «А, гэта той, хто загубіў «Стэлуцу».

С. ГРЫЦ.
Фота аўтара.

АТРАД «МЯСЦОВАГА» ПРЫЗНАЧЭННЯ

«Я НЕ ЕДУ ЗА ГРАШЫМА!»

Яны звязвалі свае мары аб студэнцкім атрадзе з дальняй дарогай, перастукам вагонных колаў, песняй ля вогнішча. Толькі з марамі сёлета давялося развітацца. Не было ні дарогі, ні вогнішча. Яны нават не пакідалі Мінск, родны універсітэт. Не буду пераконваць чытачоў у тым, што гэтыя шасцёра не шкадуюць, бо і тут знайшлі рамантыку і асалоду ад працы. Магчыма, гэта так, але думкі аб сапраўдным студэнцкім будаўнічым атрадзе з усімі яго атрыбутамі, традыцыямі і сёння вярэдзяць душу. Супакойвае адно: яны толькі другакурснікі, і ўсё яшчэ наперадзе.

Фелікс Кісялёў, Іна Мезур, Саша Бандарэнка, Ігар Рогаў, Юля Праскурава і трэцякурсніца Ала Аносава — студэнты факультэта прыкладной матэматыкі. А яшчэ — байцы камуністычнага атрада. Праўда, у мінулым годзе ў інтэрнаце № 6 працавалі пятнаццаць чалавек, а сёлета ледзь удалося набраць столькі.

— Не хочуць студэнты ісці ў такія атрады,— са спачуваннем гаворыць камендант «шасцёркі» Соф'я Паўлаўна Волкава.— Не цікава, кажуць, сумна. А вось сёлетнія мае памочнікі гэтага не скажуць. Бо сумаваць няма калі. Не паспее выехаць адна турыстычная група, як прымаем другую. Часу на замену бялізны, уборку пакояў застаецца зусім мала. Але нічога, дзяўчаты маладыя, рухавыя — паспяваюць. Зразумела, завіхацца трэба. Акрамя гэтага — сямігадзінныя дзяжурствы на вахце. Добра, што абітурыенты-медалісты пасля паспяховай здачы аднаго экзамену прыйшлі на дапамогу. За імі замацавалі уборку калідораў і кухань. Дзяўчаты і хлопцы з камуністычнага адразу адчулі палёгку. Нават вольны час з'явіўся — можна збегаць у кіно ці проста пагуляць па горадзе.

— На жаль, схадзіць некуды разам не ўдаецца,— дзеліцца думкамі Юля Праскурава.— Напэўна, таму не адчуваеш сябе ў атрадзе, а так, кожны сам па сабе. Ды і які гэта атрад — шэсць чалавек. А такія атрады «мясцовага» прызначэння вельмі патрэбныя. У інтэрнаце — самакіраванне. І выходзіць, што летам мы пакідаем свой дом без гаспадара. Байцы, якія працавалі тут мінулым летам, цалкам адрамантавалі другі паверх. А дзве швейныя машыны, што ёсць у інтэрнаце? Яны таксама куплены на грошы, зароблены байцамі атрада.

Чаму ж так доўга тады даводзіцца агітаваць студэнтаў на работу ў інтэрнаце?

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ТНГ
Gauntlet

З даведнікам на... выбары

Перад табой — трэці выпуск газеты «Гонтліт» універсітэта горада Калгары (Канада) на старонках «Беларускага універсітэта». А чацвёрты можа і не з'явіцца, бо нітачка супрацоўніцтва, якое ўжо другі год вядзецца паміж рэдакцыямі газет, становіцца ўсё танчэй.

Абарвецца яна ці не, залежыць толькі ад цябе, наш дарагі чытач. Бо тваіх канадскіх калег-студэнтаў перш за ўсё цікавяць навіны, ідэі, знаходкі, радасці і засмучэнні універсітэцкага жыцця, апісаныя самімі студэнтамі і выкладчыкамі Белдзяржуніверсітэта.

САМАЯ АСАБІСТАЯ СПРАВА

У лістападзе мінулага года Саюз Студэнтаў універсітэта Калгары разам з арганізацыяй «Элекшнз Кэнэда» і рознымі універсітэцкімі клубамі працаваў над тым, каб увесці студэнтаў у курс перадвыбарных праблем. У сувязі з маючымі адбыцца 21 лістапада федэральнымі выбарамі студсаюз спадзяваўся падняць грамадзянскую актыўнасць маладых выбаршчыкаў.



Прэзідэнт Саюза Студэнтаў Дон Козак заказаў дзве з паловай тысячы пакетаў з падборкай друкаваных матэрыялаў, якія кампанія «Элекшнз Кэнэда» бясплатна прадаставіла студэнцкім гарадкам. У кожным канверце знаходзілася па аднаму «Даведніку для студэнта-выбаршчыка». Тут была змешчана кансультацыя па пытанню: як можна галасаваць, знаходзячыся далёка ад дома. Агаворвалася, у які выбарчы ўчастак неабходна звярнуцца студэнту. Тлумачылася працэдура перадачы свайго голасу даверанай асобе. Паводле слоў Козака, здараюцца выпадкі, калі студэнты іншых выбарчых акруг аказваліся ўключанымі адначасова ў некалькі спіскаў, абое зусім не былі зарэгістраваны як выбаршчыкі.

Акрамя дапамогі ў галасаванні, Студэнцкі Саюз праводзіў работу з універсітэцкімі клубамі і палітычнымі групамі, знаёмячы студэнтаў з праблемамі, якія здольны ўздзейнічаць на іх галасаванне ў федэральных выбарах. Асноўным мерапрыемствам кампаніі былі арганізаваныя клубам Кэнэдзіан Стайдзіз дэбаты студэнтаў — прыхільнікаў трох буйнейшых партый па пытанню фінансавання сістэмы вышэйшай адукацыі. Студэнцкі Савет таксама агітаваў універсітэцкія палітычныя групы накіроўваць на дэбаты сваіх дакладчыкаў. Гэтым Козак хацеў дабіцца, каб выбары «сталі для студэнтаў самай асабістай справай». Ён імкнуўся прыцягнуць увагу да палітыкі кожнай з трох партый у найбольш важнай для студэнтаў сферы — фінансаванні сістэмы вышэйшай адукацыі. «Такім чынам,— сказаў Козак,— студэнты могуць даведацца, як іх партыя абараняе іх інтарэсы і крытычна разглядаць палітыку, якую яна праводзіць».

Марк ЛІБІН,
(для «Беларускага універсітэта»).

Фотатлумачэнне: члены Студэцкага Саюза на сходзе.

ЗАДАЧКІ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ



Канадскія выпускнікі сутыкаюцца з такімі ж праблемамі, як і савецкія: самастойнае жыццё, жаніцьба і дасягненне добрых вынікаў на першай, «сапраўднай» рабоце. Аднак канадскім студэнтам патрэбна перш за ўсё знайсці гэту работу. Пошукі прыдатнага месца з'яўляюцца іх уласным клопатам.

РАБОТА НЕ ВОЎК

Гэта не азначае, што шукаць работу — пакаранне. Наадварот, сам працэс можа прынесці задавальненне і выдатны вопыт — вызначаеш вакансіі, якія з'яўляюцца, прапаноўваеш сваю кандыдатуру і, нарэшце, паступаеш на работу, якая цябе цалкам задавальняе.

Час і намаганні, неабходныя для пошуку «ідэальнай» работы, залежаць у большай ступені ад уласнай ініцыятывы, кваліфікацыі і ад таго, па якой спецыяльнасці вы закончылі універсітэт. Для многіх выпускнікоў апошні фактар — рашаючы.

Гэта адбываецца з той прычыны, што рынак рабочай сілы па той ці іншай прафесіі можа быць вельмі непастаянны. Ва універсітэце Калгары, напрыклад, выпускнікі 1988 года трапілі ў сітуацыю, калі колькасць настаўнікаў аказалася большай за колькасць магчымых вакансій, хоць, калі яны чатыры гады назад пачыналі вучыцца, попыт на настаўнікаў быў высокім. Дарэчы, ва універсітэце прадказваюць, што да 1990 года настаўнікаў зноў не будзе хапаць.

З другога боку, выпускнікі-інжынеры не мелі ніякіх праблем з працаўладкаваннем. Альберта — правінцыя, у якой знаходзіцца Калгары,— мае багатыя запасы нафты, і многія канадскія і міжнацыянальныя нафтавыя кампаніі маюць тут свае галаўныя аддзяленні. Гэта азначае, што большасці інжынераў, калі яны захочуць, гарантаваны шырокі выбар рабочых месц у нафтавай індустрыі.

У Канадзе існуе некалькі дзяржаўных праграм, якія дапамагаюць выпускнікам знайсці работу па спецыяльнасці. Напрыклад, ва універсітэце Калгары Федэральным урадам створаны Цэнтр занятасці. Многія кампаніі і дзяржаўныя агенцтвы рэкламуюць у Цэнтры вакансіі, якія ёсць у іх для выпускнікоў, ператвараючы пошук кампаніямі кваліфікаваных работнікаў і пошук студэнтамі перспектыўнай работы ў зручны аднаступенчаты працэс.

Каб зацікавіць кампаніі ў наёме на работу студэнтаў, якія заканчваюць універсітэт па спецыяльнасцях, што не карыстаюцца попытам, федэральныя і правінцыяльныя ўлады часам прапаноўваюць кампаніям датацыі. Яны могуць прымаць форму выплаты дзяржавай часткі зарплаты паступіўшых на работу выпускнікоў ці адмены часткі падаткаў, якія прадпрыемствы павінны плаціць дзяржаве.

Многія кампаніі звязваюцца з факультэтамі універсітэта напрамую і просяць накіраваць да іх патрэбных спецыялістаў. Таму студэнтам, каб атрымаць добрыя рэкамендацыі, патрэбна падтрымліваць цесныя кантакты з выкладчыкамі.

Акрамя таго, многія студэнты аддаюць перавагу больш старадаўняму шляху — пасылаюць бясконцыя звесткі аб сабе ў розныя кампаніі, дзе ім хацелася б працаваць. Часам ім шанцуе, часцей жа яны зноў вяртаюцца ва універсітэт, каб атрымаць яшчэ адзін дыплом, перш чым уступіць у сапраўднае жыццё.

КЕН ШМАЛЬЦ,
(Для «Беларускага універсітэта»).

ФОТАТЛУМАЧЭННЕ: перш чым лавіць воўка — дачакайся дыплома.

Свята Непаслухмянасці



У гарадку універсітэта Калгары ёсць асобныя секцыі — дамы са сваім уваходам — для жанатых; зграбныя, зручныя апартаменты — для больш забяспечаных; стандартныя пакоі на некалькі чалавек у інтэрнаце — для «зялёнай» моладзі. У студэнцкім асяроддзі пануе думка, што менавіта інтэрнаты з'яўляюцца асяродкам свабоднага і бесклапотнага ладу жыцця жыхароў студгарадка.

Два універсітэцкія інтэрнаты Кананаскіс і Рандл Хол — гэта сяміпавярховыя жылыя дамы на 350 чалавек кожны. У тыповым пакоі, акрамя двух рабочых сталоў, двух крэслаў, двух ложкаў, дзвюх шафак і двух сервантаў, змяшчаюцца два студэнты-першакурснікі.

Доўгатэрміновае знаходжанне такой вялікай колькасці маладых людзей, безумоўна, нараджае розныя свавольствы: падушачныя баі, паядынкі на вадзяных пісталетах, выкарыстанне вогнетушыцеляў зусім не па іх прызначэнню, фальшывыя пажарныя трывогі і бясконцыя пікнікі па уік-Эндах — усё гэта натуральная для студэнтаў разрадка. Безумоўна, у іх асяроддзі сустракаюцца і такія, хто вядзе больш разумнае і прадуктыўнае існаванне, але яны — выключэнне і, у асноўным, пасля першага курса пакідаюць інтэрнат. З-за гэтага, а яшчэ і таму, што ўзровень паспяховасці жыхароў інтэрната нізкі, насельніцтва іх штогод аднаўляецца чарговым пакаленнем першакурснікаў.

Жыццё ў інтэрнаце ў многім залежыць ад псіхалагічнай сумяшчальнасці суседзяў па пакоі. Каб пазбегнуць спрэчак, адміністрацыя яшчэ да засялення распаўсюджвае сярод будучых жыхароў спецыяльную анкету. І ўсё ж нялёгка пасябраваць ці прыцерціся адзін да аднаго: даводзіцца карэкціраваць некаторыя рысы свайго характару. Здараецца, канфлікты прымушаюць суседзяў прасіць аб рассяленні.

Пацехі і тая спрыяльная атмасфера, што сама па сабе ствараецца ў інтэрнатах, фарміруюць мноства сяброўскіх сімпатый. Толькі тыя студэнты, у якіх дастаткова волі і мэтанакіраванасці, могуць утрымацца перад гэтай вясёлай мітуснёй, якая вызначае стыль жыцця студэнтаў — жыхароў інтэрнатаў.

Многія з тых, хто некалі жыў тут, азіраючыся назад, з задавальненнем успамінаюць пра свабоду і са шкадаваннем — пра тое, што ў рашаючыя для іх кар'еры моманты гэта свабода не была абмежавана.

Глен ЛАРСЕН

ПЛЮС ДА ВУЧОБЫ

«Наймі студэнта»

Фінансавыя праблемы студэнцкага жыцця істотна азмрочваюць яго, нават калі ўсё астатняе складваецца даволі ўдала. Многія студэнты працуюць вечарамі, каб зарабіць крыху лішніх грошай, а то і проста звесці канцы з канцамі. На жаль, работа «з'ядае» нямала каштоўнага часу, так неабходнага для заняткаў. Часовая работа рэдка добра аплачваецца, а тая, за якую плоцяць больш, звычайна кароткатэрміновая.

Таму некаторыя студэнты імкнуцца назапасіць грошай у час летніх канікулаў. Яны працягваюцца чатыры месяцы — з мая да жніўня. Па ўсёй Канадзе створаны розныя агенцтвы, каб дапамагчы студэнтам знайсці неабходную работу. Таму што студэнты-інжынеры, уявіце сабе, на любую не згаджаюцца, а аддаюць перавагу рабоце па будучай спецыяльнасці. Ва універсітэце Калгары ёсць уласнае агенцтва па працаўладкаванню такіх студэнтаў.

Існуе і дзяржаўнае агенцтва, якое называецца «Наймі студэнта». Кіраўнікі кампаній інфармуюць яго аб вакансіях, якія яны хацелі б запоўніць студэнтамі. «Наймі студэнта», у сваю чаргу, пасля абавязковай гутаркі з тымі, хто хоча ўладкавацца на работу, задавальняе просьбу агенцтва.

Па даных арганізацыі па грамадскіх сувязях, каардынуючай работу «Наймі студэнта» у Калгары, кожны дзень сюды паступае інфармацыя пра больш чым 100 вакансій. На працягу лета тысячы студэнтраў знаходзяць работу, якая звычайна аплачваецца ад 5 да 7 долараў у гадзіну.

Дзяржава таксама дапамагае студэнтам, калі выдае заёмы. Для гэтага яны павінны звярнуцца з просьбай аб заёме і заявіць пра свае збераженні, уклады і мяркуемы бюджэт на будучы акадэмічны год. Выплаты па заёму пачынаюцца праз шэсць месяцаў пасля таго, як студэнт заканчвае перыяд навучання.

Як ні парадаксальна, але студэнты, незалежна ад таго, як добра аплачваецца іх работа летам або наколькі вялікі быў заём, з вялікай цяжкасцю зводзяць канцы з канцамі. Хоць студэнты ніколі не галадаюць, складваецца ўражанне, што ім даводзіцца прыносіць сваю фінансавую забяспечанасць у ахвяру вучобе.

Дэвід ГАЗАРД,
(для «Беларускага універсітэта»).

Фотатлумачэнне: магчыма, толькі чалавек са студэнцкімі фінансамі можа дазволіць сабе такую ракошу — самы эканамічны, самы папулярны сярод студэнтаў універсітэта Калгары транспарт.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
12 кастрычніка
Зак. 1632.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.